# РЭЦЭНЗІІ

## У СКАРБОНКУ СТУДЭНТАЎ, ВЫКЛАДЧЫКАЎ, ПРАФЕСІЯНАЛАЎ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ

**Пераверзева Ю.А. Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк: вучэб.-метад. дапаможнік. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 114 с.**

Сацыяльна-культурныя парадыгмы развіцця бібліятэчнай справы ў XXI ст. прадугледжваюць новыя падыходы да падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі.

Ад бібліятэкараў у наш час патрабуюцца больш шырокае, чам раней, бачанне галіновых праблем, удзел у развіцці грамадскіх сувязей бібліятэк, праектнай, прадпрымальніцкай, фінансава-эканамічнай дзейнасці, прыцягненні пазабюджэтных сродкаў; валоданне тэхналагічнымі і сацыяльна-эканамічнымі, сацыяльна-псіхалагічнымі і педагагічнымі ведамі, навыкамі і ўменнямі працы ў калектыве. Увядзенне ў агульнарэспубліканскі класіфікатар спецыяльнасцей і спецыялізацый падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй кірунку "менеджмент" па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія" і адпаведна прысваенне часткі выпускнікоў факультэта кваліфікацыі "бібліятэкар-бібліёграф, менеджэр" зрабіла аб'ектыўна неабходнымі не толькі арганізацыйныя змены, але і перагляд канцэптуальных падыходаў да зместу выкладання.

Выкладчыкамі кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы распрацавана сістэмная канцэпцыя базавай кіраўніцкай падрыхтоўкі студэнтаў з уключэннем цыкла інавацыйных курсаў.

Фундаментальная частка профільнай кіраўніцкай дзейнасці рэалізуецца праз выкладанне новай дысцыпліны "Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк". Неабходнасць такой дысцыпліны абумоўлена спецыфікай функцыянавання бібліятэкі як гаспадарчай адзінкі, рознымі мадэлямі фінансава-эканамічнай дзейнасці, шматварыянтнымі формамі гаспадарання.

Асабліва актуальная гэта праблема на фоне сацыяльна-эканамічнай сітуацыі, у якой знаходзіцца на сучасным этапе Рэспубліка Беларусь. Перш за ўсё мы маем на ўвазе развіццё сацыяльна арыентаванай эканомікі, змяненне спецыфікі функцыяніравання сацыяльных інстытутаў, у тым ліку і бібліятэк як гаспадарчых суб'ектаў, пошук розных формаў, падыходаў, кірункаў прагматычнага гаспадарання.

Выкладчыкам кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Ю.А.Пераверзевай распрацавана праграма курса "Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк", а затым і выдадзены аднайменны вучэбна-метадычны дапаможнік.

Ідэі выкладчыка Ю.А.Пераверзевай, адлюстраваныя ў шэрагу яе публікацый, сфакусіраваны і сістэматызаваны аўтарам у гэтым дапаможніку, адрасаванаму студэнтам, выкладчыкам, бібліятэкарам-практыкам.

Дапаможнік уключае два тэарэтычныя раздзелы: "Эканоміка бібліятэчнай дзейнасці" і "Фінансаванне бібліятэчных устаноў".

Тэарэтычныя аспекты разглядаюцца аўтарам з улікам сучаснага развіцця бібліятэчнай эканамічнай навукі, пры гэтым прасочваецца гісторыка-сістэмны падыход: на розных этапах функцыяніравання бібліятэк прааналізаваны праблемы эканомікі і фінансавання бібліятэчных устаноў; вылучаны навуковыя распрацоўкі замежных спецыялістаў, паказана магчымасць іх выкарыстання ў рабоце айчынных бібліятэк.

У раздзеле "Эканоміка бібліятэчнай справы" вызначаецца месца эканомікі культуры ў народнагаспадарчым узнаўленчым працэсе, тыпы фінансавання ўстаноў культуры,

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

раскрываюцца змест і сутнасць бібліятэчных эканамічных працэсаў, паказана спецыфіка развіцця эканамічных адносін у бібліятэчнай сферы на мікра- і макраўзроўнях. Даволі грунтоўна даследаваны пытанні фарміравання эканамічнай прасторы бібліятэкі. У гэтым кантэксце прааналізаваны знешні эканамічны патэнцыял (бібліятэчная сетка рэспублікі, тэрытарыяльныя асаблівасці арганізацыі абслугоўвання карыстальнікаў, бібліятэчная сітуацыя і інш.). Вылучаны функцыі ўнутранага эканамічнага асяроддзя бібліятэкі, раскрыта фінансавая і рэсурсная складаючыя эканамічных працэсаў бібліятэчнай вытворчасці.

Аўтарам вучэбна-метадычнага дапаможніка разгледжаны пытанні бібліятэчнай мікраэканомікі, прааналізаваны падыходы да цэнаўтварэння на бібліятэчна-інфармацыйныя прадукты і паслугі, вылучаны напрамкі мікраэканамічных даследаванняў у бібліятэчнай справе, раскрыта сутнасць рэалізаваных і нерэалізаваных кірункаў фінансава-эканамічнай дзейнасці бібліятэк. У разглядаемым раздзеле вучэбна-метадычнага дапаможніка таксама знайшлі адлюстраванне тэарэтыка-метадычныя падыходы да арганізацыі гаспадарчай дзейнасці бібліятэчных устаноў; сацыяльна-эканамічныя асновы нарміравання бібліятэчных тэхналагічных працэсаў і аперацый; крытэрыі і паказчыкі эканамічнай эфектыўнасці работы бібліятэк; эканамічныя метады кіравання бібліятэкай.

Раздзел “Фінансаванне бібліятэчных устаноў” прысвечаны асновам фінансавай дзейнасці (фінансаваму механізму, напрамкам размеркавання фінансавых сродкаў, дзейнасці планава-эканамічных аддзелаў бібліятэк); пытанням фарміравання і выкарыстання фінансавых сродкаў; прынцыпам фінансавання бібліятэк; асаблівасцям стварэння і размеркавання адзінага фонду фінансавых сродкаў бібліятэкі; праблемам вызначэння фінансава-цэнасных паказчыкаў бібліятэчнай работы; вызначэнню ролі і месца платных паслуг у сістэме фінансава-эканамічнай дзейнасці бібліятэк.

Вучэбна-метадычны дапаможнік утрымлівае дыдактычныя матэрыялы. Гэта распрацоўкі семінарскіх і практычных заняткаў, парады па выкананні самастойнай работы, тэставыя пытанні. Для самастойнай работы прапанаваны пытанні і заданні да кожнай тэмы, спісы літаратуры. Дыдактычны матэрыял распрацаваны ў рэчышчы праблематыкі дысцыпліны. Ён, безумоўна, актывізуе творчы патэнцыял студэнтаў, дапамагае індывідуалізаваць навучанне.

Увогуле, канцэпцыя вучэбна-метадычнага дапаможніка адпавядае мэтам і задачам навучання студэнтаў па спецыяльнасці “бібліятэказнаўства і бібліяграфія”. Яго змястоўнае напаўненне арганічна ўключаецца ў сістэму падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў.

Вучэбна-метадычны дапаможнік можа быць выкарыстаны бібліятэкарамі-практыкамі для павышэння кваліфікацыі, а паколькі ён распрацаваны з улікам інтэграцыйных сувязей бібліятэчнай эканамічнай навукі з агульнапрафесійнымі і спецыяльнымі дысцыплінамі, то і выкладчыкамі сумежных дысцыплін.

Такім чынам, гэта добры падарунак і студэнтам, і выкладчыкам, і спецыялістам бібліятэчнай справы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Л.А.Дзямешка,***
*кандыдат педагагічных*
*навук, прафесар*